www.etnolog.org.ua

УДК 398.34(476)"20"

**СІВУРОВА ЛЮБОВ**

аспірантка Державної наукової установи «Центр досліджень білоруської культури, мови і літератури» Національної академії наук Білорусі

**SIVURAVA LIUBOU**

a graduate student at the State Scientific Institution *Centre for Studying Belarusian Culture, Language, and Literature* of the National Academy of Sciences of Belarus

**Бібліографічний опис:**

Сівурава, Л. (2021) Сучасний стан традиційного світогляду у тваринництві білорусів. *Народна творчість та етнологія,* 1 (389), 88–94.

Sivurava, L. (2021) Current State of the Traditional Worldview in the Cattle-Breeding Activities of the Belarusians. *Folk Art and Ethnology,* 1 (389), 88–94.

# СУЧАСНЫ СТАН ТРАДЫЦЫЙНАГА СВЕТАПОГЛЯДУ У ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

## Анотація / Abstract

У 2013–2014 роках було проведено письмове опитування на тему «Традиції, звичаї, ритуали, пов'язані з утриманням та доглядом за домашніми тваринами». Мета дослідження – виявити особливості та простежити еволюцію традиційного світогляду у тваринницькій діяльності білорусів. Було опитано 372 респондента з 65 районів шести областей Республіки Білорусь. Серед респондентів було виділено три вікові групи: молодь до 30 років, середнє покоління від 31 до 49 років та старші – від 50 років і старше.

Виявлено, що властивості традиційного світогляду білорусів збереглися в ритуальній практиці. Білоруси надавали великого значення народній ветеринарній медицині. Знання та навички догляду за домашніми тваринами селяни отримували насамперед від своїх найближчих родичів.

Кількість особистих селянських господарств у Білорусі має тенденцію до зменшення. Це пов'язано з низькими доходами та високими витратами на сільськогосподарське виробництво, особливо тваринництво. Ці фактори звужують сферу використання знань, умінь, навичок догляду за домашніми тваринами.

У кожному новому поколінні відбувається інтенсивна трансформація традиційного світогляду. Динаміка змін відображається на втраті худоби, знань, навичок, звуженні сфери ритуальних практик. Відбуваються чіткі зміни у світогляді молоді. Переважна більшість молоді не має інформації про ритуали першого випасу тварин. На половину менше респондентів у віці до 30 років знають про передріздвяні заборони, ніж старша вікова група.

Знання про продуктивні якості домашніх тварин поступово втрачаються. Незначна кількість респондентів може передбачити їх появу. Жодних продуктивних обрядів не проводиться. Знання з етноветеринарної медицини зменшуються. Вербальний компонент тваринницької практики переходить у пасивний стан.

**Ключові слова:** домашні тварини, традиційний світогляд, народні знання, обряди, звичаї.

In 2013–2014, a written survey was conducted on the topic *Traditions, Customs, and Rituals Related to Keeping and Caring for Domestic Animals.* The purpose of the study is to identify the features and trace the evolution of the traditional

www.etnolog.org.ua



worldview in the cattle-breeding activities of the Belarusians. 372 respondents from 65 districts of all six regions of the Republic of Belarus were interviewed. Among the respondents, three age groups were identified: young people under 30, the middle generation from 31 to 49, and elders – 50 and older.

It is revealed that features of the traditional worldview of the Belarusians have been preserved in ritual practice. Belarusians attached great importance to folk veterinary medicine. Peasants received knowledge and skills of caring for domestic animals primarily from their close relatives.

The number of personal farms in Belarus tends to decrease. This is due to low incomes and high expenses of agricultural production, especially livestock raising. These factors are narrowing the scope of using knowledge, skills, and knacks for caring for domestic animals.

In each new generation takes place an intensive transformation of the traditional worldview. The dynamics of changes is reflected in the loss of knowledge, skills, the contraction of the realm of ritual practices. There occur clear changes in the worldview of young people. The vast majority of youth do not have information on rites of the first grazing of animals. Fewer than half an under-30 respondents know about the pre-Christmas bans than the older age group.

Knowledge of the productive qualities of domestic animals is gradually being lost. A small number of respondents can predict its reappearance.  No productive rites are performed. Knowledge of ethno-veterinary medicine is declining. The verbal component of animal husbandry practice comes to be passive.

**Keywords:** domestic animals, traditional worldview, folk knowledge, rituals, customs.

Жывёлагадоўля з’яўляецца адной з прыярытэтных галін народнай гаспадаркі сучаснай Беларусі. Пераважная большасць жывёл утрымліваецца ў сельскагаспадарчых прадпрыемствах. Згодна перапісу 2009 г. у Беларусі пражывала 2 080 209 сельскіх жыхароў. У 2013 г. налічвалася 983,8 тыс. домаўладанняў [7].

У 2013–2014 гг. аўтарам было праведзена пісьмовае апытанне па тэме «Традыцыі, звычаі, абрады, звязаныя з утрыманнем і доглядам свойскай жывёлы». Мэта даследавання – выявіць спецыфічныя рысы і прасачыць эвалюцыю традыцыйнага светапогляду ў жывёлагадоўчай дзейнасці беларусаў. Было апытана 372 рэспандэнты з 65 раёнаў па шасці абласцях Рэспублікі Беларусь. Колькасць апытаных паводле узросту суадносіцца са статыстычнымі паказчыкамі колькасці сельскага насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь [6]. Сярод рэспандэнтаў былі выдзелены тры ўзроставыя групы: моладзь да 30 гадоў, сярэдняе пакаленне 31–49 гадоў і старэйшае – 50 і больш гадоў.

29,6 % рэспандэнтаў склалі мужчыны і 70,4 % – жанчыны. Па сямейным становішчы 58,1 % рэспандэнтаў – жанатыя / замужам, 4,5 % жывуць у незарэгістраваным шлюбе, 20,3 % – удаўцы / удовы, 12 % – нежанатыя / незамужнія, 5,2 % – разведзеныя. Па нацыянальнай прыналежнасці 87,6 % склалі беларусы, 2,4, 2,1, 4,8 % – рускія, украінцы, палякі і інш. Паводле сацыяльнага становішча 35,7 % рэспандэнтаў – сяляне, адпаведна 14, 20 і 19 % – рабочыя, служачыя, вясковая інтэлігенцыя. 6,5 % рэспандэнтаў маюць пачатковую адукацыю, 21 % – сярэднюю і незакончаную сярэднюю, 40,5 % – сярэдне-спецыяльную, 30,6 % – вышэйшую і незакончаную вышэйшую.

Пераважная большасць рэспандэнтаў мае добрыя жыллёвыя ўмовы і магчымасці для вядзення прысядзібнай гаспадаркі і ўтрымання свойскай жывелы. 81,3 % апытаных маюць дом з надворнымі пабудовамі, 13,8 % – кватэру ў шматкватэрным доме з надворнымі пабудовамі і толькі 4,1 % – кватэру без надворных пабудоў. З тых, хто не мае свойскіх жывёл, 20,6 % хацелі б яе набыць пры спрыяльных абставінах.

За перыяд 1993–2014 гг. колькасць надворнага статка скарацілася амаль на трэць. 66 % сялянскіх домаўладанняў зараз не ўтрымліваюць свойскую жывёлу [7]. 65,6 % не далі адказу на пытанне наконт прычын, якія перашкаджаюць утрымліваць свойскую жывёлу. Атрыманыя адказы размеркаваліся наступным чынам: сталы узрост – 11,3 %, адсутнасць надворных пабудоў (хлявоў, свінарнікаў) – 6,2 %, занятасць на працы, недахоп часу для догляду

www.etnolog.org.ua



за свойскай жывелай – 3,1 %, 3,8 % не маюць жадання і неабходнасці ў гэтым.

Асаблівасці традыцыйнага светапогляду беларусаў адлюстроўваюцца ў адносінах чалавека да свойскіх жывёл. Даследаванне пацвердзіла анімістычнае стаўленне да свойскіх жывёл як дамінуючую светапоглядную пазіцыю беларускіх сялян. 66,3 % ± 5,3 % сялян адзначылі, што «жывёла мае душу, усё ведае, але не можа сказаць». 20,3 % сумняваюцца ў адушаўлёнасці свойскіх жывёл, 73,2 % лічаць, што «жывёла прадчувае небяспеку». 94,5 % пагаджаюцца, што «жывёла разумее свайго гаспадара, выдзяляе яго сярод іншых па голасе, знешнім выглядзе»; 95,2 % – што «жывёла запамінае дарогу дадому, ведае сваё месца ў хлеве». 89,4 % апытаных сялян лічаць, што «кожная жывёла мае свой нораў, характар, не падобная на іншых па паводзінах»; «жывёла прывязана да таго чалавека, які яе корміць, даглядае»; «жывёла запамінае сваю клічку». 92 % рэспандэнтаў перакананыя, што «жывёлу нельга крыўдзіць», 72,4 % упэўненыя, што «жывёла памятае дабро, зло». Прычым, у розных узроставых групах не выяўлена адрознення ў ступені анімістычнага стаўлення да свойскай жывёлы.

Уласцівасці традыцыйнага светапогляду беларусаў захаваліся ў каляндарна-абрадавай практыцы. Пашавы сезон распачынае абрад першага выгану, сярод абрадавых дзянняў якога рэспандэнты назвалі біццё вербачкай, крапленне асвячонай вадой, «гладжанне» жывёл, выкарыстанне замоў, кармленне хлебам з прыпечка, абыход з грамнічнай свечкай. Вада ў абрадзе першага выгану з'яўляецца элементам катартычнай (ачышчальнай) магіі. Кармленне жывёл хлебам з прыпечка, абсыпанне статка хлебнымі зярнятамі і іншыя магічныя дзеянні з прадуктамі земляробства, на думку рэспандэнтаў, спрыяе шчасліваму вяртанню жывёл у гаспадарскі двор, «прывязвае» да чалавечага жытла. Спарадычна здзяйсняліся наступныя абрады: «клалі яечка пад парог, каб прыходзіла паеўшы дамоў», «мама малявала крыж на зямлі ў варотах і ўтыкала ў яго нож, выпускала карову», «на вербачку завязвалі чырвоную суконную нітку, свенцілі, а потым нітку завязвалі на рогі карове», «на сваім двары каталі яйкам па баках каровы, каб гладкая была», «падразалі хвост і вешалі на рог ленту ў залежнасці ад таго, з якога боку гналі карову на пастава, каб яна вярталася ў свой хлеў», «перад выганам на вароты хлява вешалі старыя мужчынскія штаны, шылі з пояса штаноў хамуток і вешалі на шыю карове, якой насіла усе лета», «ставілі вядро з вадой і давалі хлеб з асвечанай соллю», «хлеб абнасілі вакол стала, казалі замову "як стол пілнуецца кута, так і ты, кароўка, трымайся двара"».

У ходзе даследавання намі занатаваны прыклад імітатыўнай магіі. У в. Чарсцвяды Ушацкага раёна Віцебскай вобласці гаспадыня пасля першага выгану жывёл замятала сляды на сваім двары і гэты пясок сыпала ў хлеў з мэтай забяспечыць шчаслівае вяртанне жывёлы з поля на працягу пашавага перыяду – «як пясок застаецца ў хлеве, каб і каровы вярталіся на сваё месца».

Выгнаўшы кароў, «абходзілі статак са спечанай на полі яечняй», «пастуха кармілі як самага дарагога госця і па чарзе давалі з сабою смачны абед». 43,1 % рэспандэнтаў пазначылі, што на пастве «частавалі пастухоў яйкамі, хлебам, салам, гарэлкай і іншымі стравамі», 33,3 % – «білі вербачкай», 26,6 % – «казалі замовы, малітвы», 16,3 % – «кармілі хлебам з прыпечка».

У ходзе даследавання выяўлена, што моладзь у меншай ступені ведае жывёлагадоўчыя звычаі і абрады ў параўнанні з пакаленнем бабуль і дзядоў. У прыватнасці, «білі вербачкай» – 52,4 % і 77,0 % .

Жывёлагадоўчы складнік прысутнічае ў цыкле каляднай абраднасці. 55,7 % рэспандэнтаў ведаюць пра звычай карміць і забіваць да Калядаў свінню, гатаваць ды частавацца мяснымі стравамі і прытрымліваюцца гэтага звычаю. 48 % ведаюць пра існаванне забарон і перасцярог

www.etnolog.org.ua



у дачыненні да свойскіх жывёл падчас гадавых каляндарных свят – Каляд, Купалля, Вялікадня і інш. Прыкладна палова рэспандэнтаў дасведчаныя пра забароны каляднага часу: На Каляды «Нельга нічога пазычаць, нельга працаваць, шыць, секчы сякерай». Такім чынам, у каляндарным жывёлагадоўчым цыкле па-ранейшаму прысутнічае абрадавая дзейнасць, хаця яе роля істотна зменшылася [3, с. 463–470].

У пачатку XX ст. купальскае свята, як і раней, было прадстаўлена ў каляндарным жывёлагадоўчым цыкле комплексам абрадаў, рытуалаў, народных уяўленняў і магічных дзеянняў. Трэцяя частка рэспандэнтаў мае ўяўленне пра тое, чым карысна і чым небяспечна для свойскай жывёлы купальскае свята. Яны адзначылі, што «Купальская раса дае здароўе, прыбаўляе малако», «Многа карысці ў купальскіх травах». Іншыя мяркуюць, што «Чараўнікі ў гэты дзень могуць пашкодзіць жывёле, адабраць малако». 43,1 % асабіста прытрымліваюцца гэтых перасцярог, што сведчыць пра ўстойлівасць традыцыйнага светапогляду і яго ўплыў на сучаснае жыццё сялянства. 7,3 % памятаюць і здзяйсняюць магічныя дзеянні апатрапейнага характару, якімі ў іх мясцовасці засцерагалі жывёлу ад чарадзейства пад час Купалля і іншых свят: «Ваду нагаварвала мама», «Вешалі на шыю чырвоную кветку», «Завязвалі карове травы вакол шыі», «Ішлі па цячэнню ракі і казалі замову “белае малако, жоўтае масла”», «На вокны кладуць крапіву, пад столь вешаюць дзяды (ло́пух, дзядоўнік)», «На Юр’я выганялі на пашу і сустракалі з асвечанай вадой», «Навешвалі на дзверы хлева касу», «Падпіралі вароты ў хлеў асінавым колам, асвечаны хлеб давалі», «Прыказвалі “соль табе ў вочы”», «Раніцай абсыпалі дарогу мураўямі», «Ставілі ў варотах хлява барану зубамі на двор», «У сараі ставілі абярэг з вецця бярозы, рабіны, льну», «У сарай лажылі явар», «Чаплялі чырвоную стужку на рогі».

У беларускіх сялян застаецца распаўсюджаным уяўленне пра сурочлівасць свойскай жывёлы. 78,9 % рэспандэнтаў лічаць, што нельга хваліцца прыплодам свойскай жывёлы, паказваць нованароджаных цялят, жарабят, парасят, ягнят з прычыны таго, што можна неспадзявана сурочыць жывёлу. 17,5 % мяркуюць, што можа быць небяспечны час, 21,6 % – можна адабраць спор у гаспадарцы.

56,7 % апытаных асабіста ведаюць выпадкі, калі свойскую жывёлу сурочылі, зачаравалі. Па іх меркаванні, «сурокі» уплываюць на малочнасць кароў, паводзіны, здароўе жывёл. У сурочаных жывёл зніжаецца якасць малака, карова «не скубе травы, не ідзе дадому з поля, становіцца крытычна пужлівай, не аддае малако, бадаецц, мае хворы выгляд». Сурочаная свіння, як засведчылі інфарманты, траціла апетыт, хварэла, не карміла парасят. Конь «стрыг вушамі», «бег як спудзены раптоўна», «вельмі хутка бег», «пераставаў цянуць воз», «валіўся з ног», «кідаўся да людзей», «не даваўся запрагацца», «пудзіўся, кусаўся», «станавіўся трывожны, не паслухмяным», «не заходзіў на двор», «уцякаў з хлява», «не слухаўся гаспадара», «не хацеў заходзіць у аглоблі», «абліваўся потам, у яго з роту выдзялялася пена», «становіцца на дыбы, непаслухмяны і мужыкі выцíралі яго ізнанкай шапкі», «кепска еў», «хварэў, выпадалі зубы».

У жывёлагадоўчай дзейнасці беларусаў важнае значэнне адыгрывае народная ветэрынарыя. 74,3 % рэспандэнтаў ведаюць, як дапамагчы жывёле пры ацёле, апаросе, жарабенні. Каля паловы апытаных у складаных выпадках звяртаюцца да ветэрынараў. У выпадках хвароб і суроку пры адсутнасці ветэрынарнай дапамогі палова сельскіх жыхароў лечаць свойскую жывёлу самастойна даступнымі сродкамі, альбо звяртаюцца да суседзяў, вопытных людзей (34,7%), народных лекараў (26,8 %), знахараў (18,6 %).

Большасць сялян для лячэння хвароб свойскіх жывёл ужываюць хімічныя лекавыя прэпараты (70,8 %). Адначасова, каля паловы

www.etnolog.org.ua



выкарыстоўваюць сродкі натуральнага паходжання – травы, настоі, адвары. 40 % прадстаўнікоў старэйшай узроставай групы прамаўляюць малітвы, замовы. Аднак жа, іх ведае і выкарыстоўвае напалову менш апытаных у малодшай і сярэдняй групах (26,2 % і 21,6 %). Каля трэцяй часткі рэспандэнтаў усіх узростаў выконваюць абрадавыя дзеянні са свянцонай соллю, вадой, грамнічнай свечкай і інш.

Сяляне маюць дастатковыя веды і ўменні для аказання хірургічнай дапамогі свойскай жывёле. Яны могуць дапамагчы пры раненнях свойскай жывёлы. Прадстаўнікі старэйшага пакалення адзначаюць, што раней кастрацыяй маладняка людзі займаліся самі, альбо звярталіся да спрактыкаваных аднавяскоўцаў. У цяперашні час сялянскія падворкі ахоплены ветэрынарным абслугоўваннем. Ім займаюцца адпаведныя службы калектыўных гаспадарак. Аднак жа, пра вострай неабходнасці сучасны беларускі селянін можа ажыццявіць кастрацыю самастойна.

Жывёлагадоўчы досвед і веды назапашваліся і перадаваліся з пакалення ў пакаленне ў межах сям’і і сельскай абшчыны. Веды і навыкі догляду свойскай жывёлы сяляне атрымлівалі найперш ад бліжэйшых родзічаў. Карміць і даіць жывёлу ў 60–70 % выпадкаў рэспандэнты вучыліся ад маці, бабулі, іншы раз ад бацькі, дзядулі, гэтак жа як і памнажаць статак, даглядаць маладняк. Пасвілі з маці, бацькам, іншымі членамі сваёй сям’і. Запрагаць каня і ездзіць на ім у 31 % выпадкаў вучыў бацька.

Досвед догляду свойскай жывёлы больш за 47,1 % рэспандэнтаў набывалі ў сумеснай са старэйшымі працы, назіралі за іх дзеяннямі, 78,4 % з дзяцінства выконвалі даручэнні старэйшых членаў сям’і. 26,5 % сялян дадаткова раіліся са старэйшымі людзьмі, 11,7 % чыталі газеты, часопісы, кнігі па жывёлагадоўлі, 21,0 % вучыліся самастойна метадам спроб і памылак.

У даўнейшыя часы беларусы мелі перакананне, што чалавек «умее весці худобу, таму што мабыць нешта знае». Гэта адлюстравана ў беларускіх прыказках [1, с. 104]. У даследаванні выяўлена, што ў сялянскім асяроддзі ёсць людзі, у якіх свойская жывёла добра вядзецца. 61,2 % рэспандэнтаў асабіста ведаюць такіх асоб сярод жыхароў сваёй мясцовасці. 56,7 % апытаных сярод прычын поспехаў у жывёлагадоўчай дзейнасці называюць руплівасць, працавітасць, добрасумленнасць, іншыя гаспадарскія якасці. 14,8 % дапускаюць наяўнасць спадчынных уласцівасцей жывёлавода. 37,5 % умовай прыбытковасці ў гаспадарцы лічаць наяўнасць ведаў і ўменняў кармлення, догляду і памнажэння статка.

Як паказалі вынікі этналагічнага апытання, традыцыйны светапогляд беларускіх сялян у пачатку XXI ст. захоўвае шэраг міфалагічных рыс. У светапоглядзе сялян прысутнічае вера ў звышнатуральныя здольнасці людзей, якія могуць нашкодзіць свойскай жывёле (уяўленне пра сурочлівасць свойскай жывёлы). Жыццяздольнай застаецца практыка знахарства і чарадзейства. У жывёлагадоўчай дзейнасці выкарыстоўваецца магічная практыка (у выпадках суроку і хвароб кажуць замовы, шэпчуць, абсыпаюць соллю, акрапляюць вадой). Удойнасць кароў павялічваюць з дапамогай збору юр’еўскай, купальскай расы і паення ёю жывёл. Ужываюць іншыя знахарскія прыёмы. Праводзяцца каляндарныя і аказіяльныя абрады – абрад першага выгану, засцерагальныя магічныя дзеянні ў купальскі час, элементы абраду куплі-продажы свойскай жывёлы (продаж з вяроўкай, саджанне парасят у мех галавой, а не хвастом), табуіруюцца дзеянні ў дачыненні да прыплоду свойскай жывёлы, у перадкалядны час, міжкаляддзе і інш.

Значная частка рэспандэнтаў захоўваюць рацыянальныя веды аб прадуктыўных якасцях свойскіх жывёл. 43,6 % рэспандэнтаў далі разгорнутыя адказы на пытанне «Па якіх прыкметах адбіралі кароў “на племя”?».

www.etnolog.org.ua



32,2 % маюць падобныя звесткі пра свіней, 16,0 % – пра маладняк коней.

Найбольш трывала традыцыйныя каштоўнасці, жыццёвыя прынцыпы, ідэалы, народныя веды захоўваюць прадстаўнікі старэйшага пакалення (60–85 гадоў). Яны праводзяць каляндарныя і аказіяльныя абрады. Жанчыны сталага веку ведаюць забароны і перасцярогі міжкаляднага часу. У гэты перыяд «Нельга шыць, бо жывёлы могуць нарадзіцца з калецтвамі», «Нельга пазычаць, бо карова пацяраіць малако» (Лепельскі раён), «Жывёла звядзецца», «Нельга працаваць, бо цяжарная жывёла можа дрэнна цяліцца», «Нельга секчы сякерай, бо жывёла можа нарадзіцца з укарочанай нагой» (Ушацкі раён) [5, с. 242–247]. У купальскім, юр'еўскім абрадах у даволі разгорнутым выглядзе захавалася апатрапейная магія.

Вынікі даследавання паказваюць, што беларусы паступова адасабляюцца ад жывёлагадоўчай дзейнасці. Колькасць уласных дапаможных гаспадарак у беларусаў мае тэндэнцыю да скарачэння. Гэта звязана з малымі прыбыткамі насельніцтва і высокімі выдаткамі на вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі, асабліва жывёлагадоўлі. Пералічаныя фактары, натуральна, звужаюць сферу выкарыстання ведаў, уменняў, навыкаў догляду свойскіх жывёл. Найбольш відавочныя змены ў светапоглядзе назіраюцца ў моладзі да 30 гадоў. Пераважная большасць маладых людзей не маюць звестак пра абрадавыя дзеянні падчас першага выгану жывёлы, мала ведаюць пра апатрапейную магію купальскага дня. Напалову меней рэспандэнтаў да 30 гадоў у параўнанні са старэйшай узроставай групай ведаюць забароны і перасцярогі перадкаляднага часу. Значна меней прадстаўнікоў малодшай узроставай групы прытрымліваецца перасцярог у дачыненні да свойскай жывёлы падчас Купалля [4].

Паступова страчваюцца веды аб прадуктыўных якасцях свойскіх жывёл. Малая колькасць рэспандэнтаў можа прагназаваць прадуктыўныя якасці жывёл па вонкавым выглядзе. Не здзяйсняюцца прадуцыравальныя абрады. Выходзяць з актыўнага ўжытку веды па этнаветэрынарыі. Вербальны кампанент жывёлагадоўчай практыкі пераходзіць у пасіўны стан. Большасць апытаных не ведаюць альбо не могуць узгадаць прыказкі, прымаўкі, параўнанні, загадкі пра свойскіх жывёл. Між тым, вербальны шлях перадачы гаспадарчых ведаў па доглядзе свойскай жывёлы меў у папярэдніх пакаленнях вялікае значэнне [2, с. 90].

Такім чынам, адзначаецца інтэнсіўная трансфармацыя традыцыйнага светапогляду ў кожным новым пакаленні. Дынаміка змен адлюстроўваецца ў страце жывёлагадоўчых ведаў, уменняў, навыкаў, звужэнні сферы прымянення абрадавых практык. Гэта тлумачыцца не толькі эканамічнымі, палітычнымі, дэмаграфічнымі, але і культурнымі фактарамі: міграцыяй у гарады, паступовым знікненнем сялянскага ладу жыцця, адасабленнем моладзі ад жывёлагадоўчай дзейнасці, парушэннем міжпакаленнай культурнай трансмісіі [4, с. 77].

## Список використаних джерел

1. Касько У. Палескі дзівасіл: Беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, выслоўі: са скарбніцы А. К. Сержпутоўскага. Мінск: Выш. шк., 2005. 383 с.

2. Сівурава Л. П. Конь у сямейнай абраднасці беларусаў. *Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зб. навук. прац удзельнікаў VIII Міжн. навук. канф. (Мінск, 25–27 крас. 2014 г.)* / БДУКМ; рэдкал.: Языковіч В. Р. (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск: БДУКМ, 2014. С. 89–91.

3. Сівурава Л. П. Спецыфічныя ўласцівасці традыцыйнага светапогляду беларусаў у каляндарных звычаях і абрадах. *Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі: вып. 13* / ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры

www.etnolog.org.ua



НАН Беларусі»; навук. рэд. А. І. Лакотка. Мінск, 2012. С. 463–470.

4. Сівурава Л. П. Эвалюцыя светапогляду беларускага сялянства ў працэсе заняткаў жывёлагадоўляй (XX – пачатак XXI ст.). *Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зб. навук. прац удзельнікаў VI Міжн. навук.-практ. канф. Мінск, 26–28 крас. 2013 г. /* БДУКМ; рэдкал.: Языковіч В. Р. (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск: БДУКМ, 2013. С. 75–78.

5. Сівурава Л. П. Традыцыйны светапогляд у жывёлагадоўчай дзейнасці беларусаў Падзвіння. *Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. артыкулаў II Міжнар. навук. канф., Полацк, 17–18 крас. 2014 г.: у 2 ч.* Ч. 1 / Полацкі дзярж. ун-т; пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача, С. А. Шыдлоўскага. Наваполацк, 2014. С. 242–247.

6. Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь. URL: https://www.mshp.gov.by/. (дата обращения: 14.03.2015 г.).

7. Официальный сайт Национального статистического комитета Республики Беларусь. URL: https://www.belstat.gov.by/. (дата обращения: 16.02.2015 г.).

## References

1. KAŚKO, Uładzimir. *Paliessie Elecampane: Belarusian Folk Proverbs, Sayings, and Expressions: From the Treasury of Alaksandar Sjeržputoŭski*. Mjensk: Higher School, 2005, 383 pp. [in Belarusian].

2. SIVURAVA, Liubou. Horses in Familial Rites of the Belarusians. In: Viktor JAZYKOVIČ (editorial board's chair). *Authentic Folklore: Problems of Its Preservation, Research, and Perception: Collected Scientific Papers of Participants in the VIIIth International Scientific Conference (Minsk, April 25–27, 2014)*. Belarusian State University of Culture and Arts. Mjensk: BSUCA, 2014, pp. 89–91 [in Belarusian].

3. SIVURAVA, Liubou. Specific Features of the Traditional Worldview in Belarusians in Calendar Customs and Rites. In: Alaksandr ŁAKOTKA (scientific editor). *Issues of Art History, Ethnology and Folklore Studies: Issue 13*. State Scientific Institution *Centre for Studying Belarusian Culture, Language, and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus*, Mjensk, 2012, pp. 463–470 [in Belarusian].

4. SIVURAVA, Liubou. Evolution of the Belarusian Peasantry Worldview While Breeding Cattle (XX - early XXI century.) In: Viktor JAZYKOVIČ (editorial board's chair). *Authentic Folklore: Problems of Its Preservation, Research, and Perception: Collected Scientific Papers of Participants in the VIth International Theoretical and Practical Conference (Minsk, April 26–28, 2013*. Belarusian State University of Culture and Arts. Mjensk: BSUCA, 2013, pp. 75–78 [in Belarusian].

5. SIVURAVA, Liubou. Traditional Worldview in the Cattle-Breeding Activities of the Over Dzvina Lands' Belarusians. In: Dzianis DUK, UŁADZIMIR ŁOBAČ, Sjargjej ŠYDŁOŬSKI, eds.-in-chief, *The Belarusian Over Dzvina Lands: Experience, Methods and Results of Field and Interdisciplinary Studies: Proceedings of the IInd International. Scientific Conference (Połack, April 17 –18, 2014): Collected Scientific Articles in Two Parts*. Pt. 1. Połack State University. Navapołack, 2014, pp. 242–247 [in Belarusian].

6. *Ministry of Agriculture and Food of the Republic of Belarus* (official website) [online]. Available from: https://www.mshp.gov.by/ (accessed 14 March 2015) [in Russian].

7. *National Statistical Committee of the Republic of Belarus* (official website) [online]. Available from: https://www.belstat.gov.by/ (accessed 16 February 2015) [in Russian].